# КАТЭГОРЫЯ ЧАСУ Ў ВЕРСЭТАХ А. РАЗАНАВА

**Т. А. Лозка**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, вул. Савецкая, 104, 246019, г. Гомель, Беларусь, sandalka@mail.ru*

Разглядаюцца асобныя аспекты мастацкага выяўлення і асэнсавання катэгорыі часу ў версэтах А. Разанава. Аналізуюцца моўныя сродкі, з дапамогай якіх перадаецца ідэя часу. Сцвярджаецца, што ў версэтах тэмпаральная арганізацыя суадносіцца пераважна з цяперашнім часам, што стварае эфект прысутнасці. Звяртаецца ўвага на выкарыстанне прыёму рэтраспектывы, своеасаблівасць узаемадзеяння розных часавых планаў.

***Ключавыя словы:*** беларуская літаратура; версэты А. Разанава; катэгорыя часу.

Час, як і прастора, з'яўляецца неад'емнай уласцівасцю рэальнасці. Паняцце часу знаходзіць сваё асэнсаванне ў розных навуках, такіх як фізіка, матэматыка, філасофія. У філасофіі час вызначаецца як «форма быцця матэрыі, якая выражае працягласць яе існавання, паслядоўнасць змены стану ў змяненні і развіцці ўсіх матэрыяльных сістэм» [1, с. 40]. Пры гэтым большасць філасофскіх падыходаў сцвярджае, што час аднамерны, незваротны і заўсёды накіраваны ад мінулага да будучага.

Сваё асэнсаванне катэгорыя часу атрымала і ў літаратуразнаўстве. Адным з першых да даследавання мастацкага часу звярнуўся А. Патабня. У межах разнастайных тыпалогій навукоўцы вылучаюць час аб'ектыўны і суб'ектыўны, канкрэтны і абстрактны, рэальны, ірэальны і віртуальны, цыклічны і лінейны, сюжэтны, фабульны і падзейны, аўтарскі час, час персанажаў і г. д. Формы мастацкага часу залежаць ад родавай і жанравай спецыфікі твора, мастацкага напрамку і метаду, задумы твора і аўтарскай сістэмы ўяўленняў у цэлым.

Менавіта літаратура выступае тым відам мастацтва, які з дапамогай вербальнай знакавай сістэмы ўзнаўляе рэальнасць і, што важна, узнаўляе яе ў працэсе, у дынаміцы. Катэгорыя часу вынікае з твораў літаратуры як натуральна ўласцівая гэтаму віду мастацтва. Пры гэтым, у параўнанні з іншымі відамі мастацтва, літаратура найбольш свабодна можа абыходзіцца з часам. У залежнасці ад аўтарскай ідэі характэрныя для рэальнага часу аднамернасць, незваротнасць і скіраванасць у будучае ў тканіне тэксту могуць парушацца. У літаратуры не абавязкова захоўваецца храналагічная паслядоўнасць, ссоўваюцца і мяняюцца месцамі адрэзкі часу на часавай восі – мінулае і будучае выступаюць як цяперашняе і г. д. Мастацкі час не падпарадкоўваецца звыклым нормам і правілам, асабліва ў творах мадэрнізму і постмадэрнізму, дзе сюжэт можа развівацца ў любых

напрамках і паслядоўнасці («Хазарскі слоўнік» М. Павіча), а час можа быць кампанентам псіхалагічнага быцця чалавека («Уліс» Дж. Джойса).

Своеасабліва катэгорыя часу выяўляецца ў лірыцы. Гэта абумоўлена тым, што ў адрозненне ад эпічных твораў, заснаваных на апавядальнасці і выражанай падзейнасці, якая непасрэдна звязана з часам, аснову лірыкі складаюць эмоцыі, адносіны да падзей (хаця падзейнасць, а значыць і сюжэтнасць, у той ці іншай форме можа прысутнічаць у творах усіх родаў літаратуры). Прааналізуем спосаб адлюстравання часу ў версэтах А. Разанава, выявім фармальныя паказчыкі часу і акрэслім асобныя аспекты ўзаемадзеяння часавых планаў у лірыцы паэта.

Увасабленне ідэі часу ў версэтах адбываецца праз указанне на маркеры часу – тысячагоддзі, стагоддзі, гады, дні, поры года, часткі сутак і інш.:

*З дня ў дзень, з году ў год, з веку ў век збіраюся з тайнаю моцай…* [2, с. 329];

*Я доўга чакаў яго – можа гады, а можа, дзесяцігоддзі…* [2, с. 342];

*…мы… распланавалі сваё жыццё далёка наперад – на дзесяцігоддзі, стагоддзі, але…* [2, с. 259];

*За доўгія тысячагоддзі ўсё з’ела сырая зямля дарэшты: і косці людзей, і палотны адзення, і труны – з дубу, з грабу, з сасны* [2, с. 321].

У вышэйпрыведзеных прыкладах называнне маркераў часу прадстаўлена ў такой форме, якая дазваляе перадаць ідэю неперарыўнасці часу. Час тут выступае як працэс, які не мае пачатку і завяршэння – іншымі словамі, час падаецца ў значэнні «доўга», «заўсёды» ці наогул выяўляецца ў той сваёй іпастасі, што называецца вечнасцю:

*З веку ў век ляжаў ля гасцінца камень.*

*З веку ў век ішлі па гасцінцы людзі* [2, с. 289].

Такая характарыстыка часу, як працягласць, падкрэсліваецца і з дапамогай моўных канструкцый, якія не ўтрымліваюць указання на часавыя адрэзкі:

*…і толькі бягуць па небе аблокі…* [2, с. 239];

*А я ўсё стаю на тым самым месцы* [2, с. 245];

*Кашу траву, якую касіў перад гэтым, – атаву* [2, с. 307];

*А сведчанні дрэў так і застаюцца непачутыя* [2, с. 227].

Разам з тым час як катэгорыя быцця характарызуецца дыскрэтнасцю (ад лац. *discretus* – ‘падзелены, перарывісты’): у чалавечым уяўленні час дзеліцца на пэўныя перыяды, якія маюць пачатак і канец. У версэтах А. Разанава ідэя дыскрэтнасці часу перадаецца таксама праз вышэйзгаданыя маркеры часу ў значэнні часавых адрэзкаў, якія падаюцца ў супастаўленні з пэўнымі падзеямі, што служаць кропкай адліку:

*На другі год вайны…* [2, с. 252];

*...і ўжо цяжка злічыць, колькі гадоў мінула, як ён са сваім самалётам, уцягнуты ў вір апраметнага віражу, разбіўся* [2, с. 358].

Чляненне часу паказваецца праз антанімічныя структуры, у якіх процiпастаўляюцца часавыя адрэзкі ці падзеі, якія ім спадарожнічаюць:

*І не хапае мне дня, каб усюды паспець, і не хапае начы, каб адусюль вярнуцца...* [2, с. 241];

*У ранні карона знайшлася, а ўдзень яе ўкралі* [2, с. 291].

Таксама ў лірыцы паэта час выяўляецца праз звыклы падзел на мінулае, цяперашняе і будучае:

*Я парываюся з мінулага ў сёння* [2, с. 222];

*Мінулае тоіцца ў змроку, будучыня – у светлыні* [2, с. 285].

Спосабам адлюстравання часу ў паэта служыць указанне на ўзрост аб’екта ці асобы, канкрэтнае ці абагуленае:

*– О, яму безліч гадоў, – кажа брат. – І высечаны ён з дрэва, якога цяпер няма ўжо...* [2, с. 285];

*А на драўляным парозе сядзіць нядужы стары чалавек...* [2, с. 276];

*...бягуць басаногай чародкаю дзеці...* [2, с. 295];

*Колішні брыгадзір паляводчай брыгады Іван Шаўкаловіч, па-вулічнаму Гуговіч, калісь казаў, што ён пражыве семдзесят два гады* [2, с. 262].

Час можа пазначацца аўтарам апасродкавана – праз намінацыю гістарычнай эпохі ці праз ужыванне стылістычных фігур з тэмпаральнай семантыкай:

*...гаршчок старажытных рымскіх дынараў* [2, с. 346];

*...хаціны, утуленыя ў даўніну, пагорак, дзе нешта было, а цяпер зарасло дзірваном і рассыпалася на каменне...* [2, с. 349].

Як бачым, у якасці фармальных паказчыкаў часу ў версэтах А. Разанава выступаюць лексічныя і стылістычныя сродкі. Некалькі слоў варта сказаць пра выяўленне катэгорыі часу і на ўзроўні граматыкі – сінтаксісу і марфалогіі. Мастацкі час, як і час рэальны, звязаны з паняццем «падзея», прычым у літаратурнай творчасці яно можа разумецца даволі шырока. Як адзначае У. Чараднічэнка, «літаратурная падзея ёсць нешта, што адбываецца ў літаратурнай рэчаіснасці, любы фіксаваны зрух у мастацкай карціне свету, светаадчуванні той ці іншай асобы (персанажа, лірычнага героя) ці яго паводзінах. Пры такім падыходзе любы зафіксаваны зрух (знешні альбо ўнутраны, здзейснены альбо меркаваны), любы жэст незалежна ад значнасці кваліфікуецца як падзея» [3, с. 12]. Важную ролю ў выяўленні часу адыгрываюць падзеі і ў А. Разанава, на часавыя адносіны ўказвае паслядоўнасць іх працякання:

*Перад тым, як пачнецца бітва, бяссонныя звездары развважаюць-гадаюць, чым яна скончыцца...* [2, с. 290];

*Гэта было да таго, як выпаў аднаго разу шкляны дождж...* [2, с. 295];

*Каб трапіць у глыбіню, я набіраю паветра ў грудзі і бяру ў рукі камень. <…> Ледзьве жывы, выбіраюся я на бераг* [2, с. 247].

Таксама час у мастацкім творы ўспрымаецца дзякуючы сувязі паміж падзеямі – яны могуць быць прычынна-выніковымі, псіхалагічнымі, асацыятыўнымі і г. д.:

*Іван Арабейка п'е. І я п'ю, сціскаючы зубы таксама.*

*Потым мы будзем хварэць, будзем пакутаваць, але будзем ведаць, што далучыліся да самой сутнасці свету і што пілі з крыніцы, з якой піў святы* [2, с. 317].

У пераважнай большасці версэтаў тэмпаральная арганізацыя суадносіцца з цяперашнім часам, што выражаецца адпаведнай формай дзеяслова:

*Я чую шмат слоў* [2, с. 265];

*Крышыцца пад нагамі зашэрхлы снег* [2, с. 239];

*Раскопваюць гарадзішча* [2, с. 254].

Таксама суаднесенасць з сучаснасцю выражаецца пасродкам ужывання бездзеяслоўных сінтаксічных канструкцый, якія імпліцытна паказваюць на цяперашні час:

*У завеі – зямля, у завеі – дрэвы…* [2, с. 238];

*У маіх руках абраз, на якім няма ніякай выявы, ніякіх рысаў, –*

*чорны драўляны абраз* [2, с. 240].

Яшчэ адным паказчыкам цяперашняга часу ў А. Разанава выступае акалічнасць месца:

*Нібы раздарожжа, я паказваю ўсім, куды ісці, а сам застаюся на месцы – на гэтай зямлі, пад гэтым небам. <…>*

*Тут мой захад, і тут – усход* [2, с. 232].

Акалічнасць, якая мае прасторавае значэнне (на гэтым месцы, на гэтай зямлі, пад гэтым небам – тут), у дадатак да пэўнай формы дзеяслова падкрэслівае суаднесенасць з цяперашнім часам (тут і цяпер). Дамінуючая роля цяперашняга часу сведчыць пра непасрэднае перажыванне рэчаіснасці паэтам: знаходжанне ў кантэксце бягучай сітуацыі робіць працэс пазнання больш інтэнсіўным. Формы цяперашняга часу ўцягваюць чытача ў падзеі твора, ствараюць ілюзію прысутнасці, што спрыяе больш моцнаму ўздзеянню і далучэнню да перажыванняў лірычнага героя.

На такім жа прынцыпе пабудаваны версэты А. Разанава, якія ўяўляюць сабой успаміны. Падзеі, што належаць да мінулага, у іх прадстаўлены праз цяперашні час, што стварае цікавае ўзаемадзеянне розных часавых планаў. Псіхолаг К. Левін увёў паняцце часавай перспектывы, сутнасць якога ў тым, што чалавек не толькі бачыць сваё цяперашняе, але мае і пэўныя чаканні адносна будучага, і ўспаміны пра сваё мінулае. Як лічыць К. Левін, «часавая перспектыва ўяўляе сабой сумяшчэнне

будучага і мінулага, рэальнага і ідэальнага плана жыцця ў плане дадзенага моманту» [4, с. 319].

Сумяшчэнне часавых пластоў назіраем у версэтах «Мяжа», «У старой хаце», «Сіні туман». Яны маюць пэўную падзейнасць, якая перадаецца праз формы цяперашняга часу і ствarae ўражанне працякання ў бягучы момант: *«…і бацька, панурыўшы галаву, стаіць на мяжы з касою»* [2, с. 244], *«…у той старой хаце з сябрынаю за сталом сядзіць невясёлы бацька»* [2, с. 251], *«...я стаю каля сваёй хаты»* [2, с. 253]. Кампазіцыйна творы пабудаваны так, што пласт мінулага часу, да якога належаць успаміны, прачытваецца не адразу: паэт не выкарыстоўвае канструкцый кшталту пушкінскага «Я помню чудное мгновенье», і нам падаецца, што гаворка ідзе пра падзеі, якія разгортваюцца на нашых вачах. Толькі ў другой частцы, дзякуючы створаным паэтам вобразам, мы разумеем, што гэта ўспаміны. Так, у версэце «Мяжа» паўстае вобраз бацькі на полі, далейшага развіцця сюжэта няма – перад намі імгненны здымак рэчаіснасці, які, зыходзячы з наступных радкоў, належыць мінуламу:

*Даўно ўжо стаіць – заржавела яго каса,*
*счарнела касільна,*
*праз скошаную траву прарасла маладая...* [2, с. 244].

Вобраз мяжы, на якой стаіць бацька паміж правым і левым бокам поля, шматпланавы. З’яўляючыся важным элементам прасторава-часавай арганізацыі твора, яна, з аднаго боку, дзеліць прастору на дзве часткі – рэальнасць і іншабыццё, гэты і той свет. З другога боку, мяжа змяшчае часавую семантыку – яна дзеліць час на мінулае, у якім застаўся бацька, і цяперашняе аўтара, які яго ўспамінае. Пры гэтым А. Разанаў дасягае такой паглыбленасці ў мінулае, што гэты часавы пласт нібы ссоўваецца ў цяперашняе. Моц перажывання эпізода мінулага сумяшчае ў прасторы часавыя планы, на што ўказвае і апошні радок, дзе бацька *«і бачыць не бачыць, як ззяе на небе адразу два месяцы – ветах і маладзік»* [2, с. 244].

Версэт «У старой хаце» расказвае пра восеньскі дзень, калі бацька просіць пайсці купіць ежы і пітва. Лірычны герой праходзіць каля глыбокіх чыстых азёр, а потым, што нечакана, садзіцца ў імклівыя цягнікі – і гэты вобраз дарогі жыцця аддаляе ў прасторы бацьку і сына. І зноў перад намі выхаплены момант мінулага, які ў якасці ўспаміна працягвае сваё існаванне ў цяперашнім:

*...усё заняў сабой гэты дзень,*
*на ўскрайку якога ў старой сутонлівай хаце сядзіць па-ранейшаму за сталом з сябрынай сваёю бацька і ўсё чакае, калі я вярнуся* [2, с. 251].

Звяртаючыся да ўспамінаў, чалавек судакранаецца з мінулым на ментальным узроўні. У А. Разанава такое ўзаемадзеянне – не проста палёт думкі, у версэтах стварaецца пачуццё фізічнай прысутнасці ў эпізодах

мінулага. Паколькі ўнутраныя працэсы таксама адбываюцца ў часе, даследчыкі вылучаюць псіхалагічны час. У залежнасці ад падзей, ступені іх значнасці для чалавека псіхалагічны час можа трансфармавацца – замаруджвацца ці паскарацца, альбо застываць, як у версэтах А. Разанава.

«Сіні туман» – яшчэ адзін успамін, звязаны з дзяцінствам ці юнацтвам паэта. Псіхалагізацыя часу ў гэтым версэце таксама выяўляецца ў выглядзе сумяшчэння розных часавых планаў. Лірычны герой стаіць каля сваёй хаты, а ў канцы вуліцы, у сінім тумане, бачыць сваіх сяброў і сябе самога:

*Я думаю – не надумваюся, і няма ў каго папытацца, як гэта так адбылося, што я не з усімі, што я падзяліўся надвое, што я не ў вясне і ў вясне…* [2, с. 253].

Як вынікае з тэксту, герой перажывае вопыт адначасовага знаходжання ў дзвюх часавых і прасторавых кропках. Прастора, адкуль адбываецца рэтраспектыва, і прастора ахутанага вясной дзяцінства і, адпаведна, час у кропцы «цяпер» і мінулы час з’ядноўваюцца ў чалавеку. *«Я падзяліўся надвое», –* піша паэт у «Сінім тумане», што дапамагае зразумець радкі версэта «Вобразы вабяць»: *«Дзеліць мяне прастора, з’ядноўвае час»* [2, с. 309]. Калі прастора звязана з матывам раздзялення (імклівыя цягнікі пераносяць чалавека ў прасторы, але нейкая яго частка застаецца з тым, што блізкае сэрцу), то час як складнік прасторава-часавага кантынуума дазваляе інтэграваць вопыт, атрыманы на розных этапах жыцця.

Мы разгледзелі асобныя аспекты мастацкага выяўлення і асэнсавання катэгорыі часу ў версэтах А. Разанава. Для выяўлення ідэі часу паэт выкарыстоўвае разнастайныя марфалагічныя і сінтаксічныя, лексічныя і стылістычныя сродкі, у тым ліку часавыя маркеры, моўныя канструкцыі з тэмпаральнай семантыкай, паслядоўнасць падзей і прычынна-выніковыя сувязі паміж імі. У пераважнай большасці версэтаў тэмпаральная арганізацыя суадносіцца з цяперашнім часам, што дазваляе стварыць эфект прысутнасці. Неаднаразова паэт звяртаецца да прыёму рэтраспектывы, калі адбываецца ўзаемапранікненне і сумяшчэнне розных часавых планаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Яблонских А. А.* Пространство и время как формы бытия природы и общества // Вестн. ТвГУ. 2018. № 2. С. 40–46.

2. *Разанаў А.* Танец з вужакамі: Выбранае. Мінск : Маст. літ., 1999.

3. *Чередниченко В. И.* Типология временных отношений в лирике. Тбилиси : Мецниереба, 1986.

4. *Левин К.* Динамическая психология. М. : Смысл, 2001.